# АБ’ЯВА

### *Да ўвагі*
### *членаў Гродзенскага абласнога аддзялення*
### *Саюза пісьменнікаў Беларусі!*

**Паважаныя сябры, рэдакцыйная калегія абласнога літаратурнага альманаха "На Нёманскай хвалі" аб'яўляе прыём матэрыялаў для чарговага, шостага нумара перыядычнага выдання, якое з’яўляецца афіцыйным друкаваным органам Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Выхад альманаха запланаваны на бягучы год.**

## *Патрабаванні да тэматычнага зместу*

**Паважаныя калегі! Бягучы год аб'яўлены ў нашай краіне Годам малой радзімы. Кожны з нас па-свойму разумее гэта паняцце, але ўсе без выключэння знаходзяць у ім асаблівы – глыбокі, свяшчэнны сэнс. Прапануецца прысвяціць гэтай тэме новы нумар нашага абласнога літаратурнага альманаха і пагутарыць на гэтую тэму з яго чытачамі. Можна не сумнявацца – усіх нас чакае займальнае літаратурнае падарожжа па нашай любімай воднай артэрыі – бацьке-Нёману і па яго прытоках на сімвалічнай хвалі – хвалі малой радзімы.**

**Дарагія сябры, збіраючыся ў дарогу, нам застаецца толькі пажадаць адзін аднаму, каб гэты маршрут стаў рухам да творчага росту і максімальнай рэалізацыі ўсіх намечаных задум, а галоўнае – каб гэтая праца яшчэ больш згуртавала і аб'яднала наш пісьменніцкі калектыў і нашу чытацкую супольнасць. У добры шлях!**

## ***Патрабаванні да аб'ёму і афармлення матэрыялаў:***

**проза – не больш за дзесяць старонак тэксту ў фармаце А4 праграмы Word;**

**паэзія – не больш за дзесяць вершаў сярэдняй велічыні;**

**шрыфт – Times New Roman; памер шрыфта – 14; міжрадковы інтэрвал – 1,0.**

**Неабходна дадаць да мастацкіх тэкстаў самыя свежыя біяграфічныя звесткі пра іх аўтараў, а таксама вашыя каляровыя фота партрэтнага тыпу.**

## ***Тэрмін падачы матэрыялаў***

**працягваецца да 1 верасня 2018 года ўключна.**

**Творы можна дасылаць на адрас электроннай пошты Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі:**

**postmaster@pisateli.by**

**або прыносіць асабіста на электронных носьбітах у офіс ГАА «СПБ».**
**Тэлефоны для даведак: 60-20-22; 60-48-98**

***Да сустрэчы на старонках абласнога літаратурнага альманаха «На Нёманскай хвалі» # 6 !***